*Класікі зблізку*

# ЯКУБ КОЛАС І ЯНІНА КУЛАКОЎСКАЯ: ГІСТОРЫЯ ПЕРАПІСКІ



**Яніна Кулакоўская.** Надпіс на адваротным баку: **«Гале от Нины. 29.VI.52 г. Минск».**

Кулакоўская Яніна Ульянаўна (1918 – 1999), настаўніца беларускай мовы і літаратуры, была жонкай вядомага беларускага пісьменніка Аляксея Кулакоўскага.

Знаёмства Якуба Коласа з Янінай Кулакоўскай адбылося ў маі 1954 г. у доме адпачынку Саюза пісьменнікаў "Каралішчавічы", дзе Яніна Ульянаўна адпачывала з трыма сыночкамі, Жэнем, Лёнем і Міколкам, і адначасова рыхтавалася разам з сяброўкамі-аднакурсніцамі Галінай Зяновіч, Аленай Белавусавай, Галінай Доўнар да дзяржаўных экзаменаў. Пазней Галіна Зяновіч так напіша пра тыя дні: *"Усё лета Ніна Ульянаўна з дзецьмі была ў доме адпачынку. З гэтымі падшыванцамі было нямала клопату, але і шмат вялікай мацярынскай радасці. На прывабную жанчыну, клапатлівую маці, што не толькі гадавала траіх сыночкаў, але і вучылася, не мог не звярнуць увагі і такі цудоўны знаўца чалавечай душы, як Якуб Колас. Ён часта бываў тут, любіў пагаманіць з дзеткамі і пагаварыць з іх маці – прыгожай, добразычлівай, разумнай, адукаванай жанчынай. Ён, безумоўна, добра ведаў, якім шчырым дарадцам, памочнікам і верным спадарожнікам у жыцці была Ніна Ульянаўна для свайго мужа"* [2, с. 98].

Маці трох сыноў, будучая настаўніца беларускай мовы, верная спадарожніца жыцця і памагатая ў літаратурнай працы свайму мужу-пісьменніку. Пра што мог падумаць Якуб Колас, пазнаёміўшыся з такой жанчынай? Каго мог прыгадаць? На гэтае пытанне, здаецца, ёсць адзін адказ: Якуб Колас, сустракаючыся з Янінай Ульянаўнай і яе сям'ёй, зноў у сваіх думках вяртаўся ў тую шчаслівую пару, калі была яшчэ жывая яго Марыя Дзмітрыеўна, сын Юрка і калі ўсе яны былі разам.

Перапіска паміж Якубам Коласам і Янінай Кулакоўскай пачалася не адразу. Толькі ў наступным 1955 г., калі выйшла ў свет трылогія "На ростанях", Якуб Колас звярнуўся з першым лістом да Яніны Ульянаўны, якім паклаў пачатак перапісцы, што доўжылася да студзеня 1956 г. Відавочна, што Коласам рухала глыбокае пачуццё адзіноты апошніх гадоў жыцця, пра якое шмат вядома даследчыкам шляху песняра з іншых крыніц. Яніна Ульянаўна, поўная хатніх і працоўных клопатаў, са свайго боку заўсёды старалася ветліва адказаць жывому класіку.

*«1.VIII.1955 г.*

*Дарагая Ніна Ульянаўна!*

*Пасылаю Вам "На ростанях". Гэта летапіс майго маладога жыцця. Успамінайце зрэдку "Андрэя Лабановіча", які прыносіць Вам самую шчырую падзяку за тое, што Вы скрашвалі і аздаблялі маё старэчае адзіноцтва ў Каралішчавічах. Я быў той магнітнаю стрэлкаю, што заўсёды паварочваецца на поўнач, але Вы не Поўнач, а ясны ўсход. Покі жыць буду, буду успамінаць Вас.*

*Вашай цудоўнай сястрыцы перадайце маё сардэчнае прывітанне. Цалую вашых слаўных дзетак»* [2, с. 99].

Яніна Кулакоўская адказвала:

*«25/VIII – 55 г.*

*Добры дзень, шматпаважаны Канстанцін Міхайлавіч!*

*Не знаходжу тых высокіх слоў, якімі па-сапраўднаму можна было-б выразіць падзяку Вам за Вашы добрыя адносіны да нас, за Вашу ўвагу да нашай сям'і.*

*Скажу простымі словамі, але-ж ад усёй душы шчырае, шчырае дзякуй Вам за ўсё. Ад шчырага сэрца дзякую і за п'есы Вашы. Я іх з такой-жа*



**Яніна Кулакоўская з сынамі Жэнем і Лёнем.**

*цікавасцю буду перачытваць, як і "На ростанях".*

*Жадаю Вам добрага здароўя.*

*З вялікай пашанай да Вас*

*Кулакоўская»* [1, адз. зах. 42].

Якуб Колас, відаць, ужо нямала стомлены пафаснымі словамі на свой адрас, нават злёгку папракнуў Яніну Ульянаўну за пэўны тон: *"Ваша пісьмо, на якое я адказаў Вам, я часта чытаю, перачытваю, не гледзячы на тое, што тон пісьма, я сказаў бы, занадта афіцыйны"* [2, с. 100]. Паэт з настальгіяй узгадваў адпачынак у Каралішчавічах і выказваў жаданне зноў сустрэцца з сям'ёй Кулакоўскіх: *«Нявесела зараз у Каралішчавічах. Няма ні дзяцей, ні іх мацярок і асабліва адной, "Яснага Ўсходу". Дзякую Вам за вестачку. Будзе час, як-небудзь сустрэнемся, але гэта будзе тады, калі прыедзе Аляксей»* [2, с. 100].

На першую такую сустрэчу, прызначаную на 18 верасня, Якуб Колас запрасіў да сябе Яніну Ульянаўну з трыма "багатырамі" і яе сястру Жэню. Аднак яна не адбылася: *"У тым пісьме я запрашаў Вас і дзетак Вашых да сябе, на 18-е верасня (IX). Абставіны змяніліся: 18.IX мяне дома не будзе. Аб гэтым з жалем і хачу сказаць Вам у сваім пісьме. <…> Усяго Вам найлепшага. Выбачайце, што так сталася – не па маёй віне"* [2, с. 100].

Якуб Колас не мог забыцца пра новых знаёмых, якія паспелі стаць блізкімі яго сэрцу. Ён амаль з юначым рамантызмам працягваў думаць пра Яніну Ульянаўну: *"Амаль кожны дзень праязджаю я праз Круглую плошчу, прыглядаюся да Вашага балкону. Вокны на балкон часцей зачынены, і толькі раз убачыў я, як здалося мне, Вашага сына"* [2, с. 101].

Зрэшты, у тым самым лісце Якуб Колас прызнаецца, што адчувае сябе "не дужа добра" і збіраецца "паляжаць у стацыянары" [2, с. 101]. Наступны ліст ужо адтуль і прыходзіць: *«Учора прыехаў сюды. Настрой быў паніжаны. Лёг спаць і не мог заснуць. Глытаў люмінал, а ўсё роўна спаў мала, устаў з цяжкай, як кацёл, галавой. Сягоння спрабаваў заняцца якой-небудзь работаю, ды і работа не клеіцца. Палажылі мяне ў тэрапеўтычны аддзел. Гэта на 3-м паверсе, палата №12. Называецца яна "люкс". Выходзіць на вуліцу. Называецца вуліца, здаецца, Беларускай. Вуліца шумная. Усю ноч аж да раніцы грукочуць грузавікі і трамваі. Думалася, што я адпачну тут, а выходзіць так, што прыдзецца адпачываць па выхадзе са стацыянара»* [2, с. 101]. Колас не быў бы самім сабой, каб у тыя дні пачатку кастрычніка не паразважаў на грыбную тэму: *"А зараз і пагода добрая. У лясках непадалёку ад Мінска (ехаць па аўтастрадзе Мінск – Масква, першы хвойнічак – справа – едучы з Мінску, насупраць могілак) пападаюцца маслякі (я называю іх казлякамі), часам пракідаюцца і рыжыкі"* [2, с. 101 – 102].

З чарговага ліста ў адказ Яніны Кулакоўскай вынікае, што і сам Аляксей Кулакоўскі меў клопаты са здароўем: *"Захварэў Аляксей. Вось ужо ад чацвярга ляжыць. Забалела нага і дала высокую тэмпературу. Другі дзень ужо тэмпература нармальная, але уколы яшчэ даюць, бо нага баліць, не можна стаць на яе. І самі не ведаем, адчаго яна забалела, дактары не могуць сказаць. Гавораць толькі, што трэба вылежаць, і ўсё пройдзе. І вось ляжыць чалавек (і сядзіць) і злуецца на гэтыя ўколы і на сваю ўласную нагу, што трымае яго дома і адрывае ад працы"* [1, адз. зах. 96].

Якуб Колас у гэтай сувязі прыгадвае, як ён вылечыў ад падобнай хваробы сваю жонку: *«Нага дзе-небудзь магла быць застужана, вось яна і забалела. На месцы Аляксея я папрасіў-бы жонку – Вас, вядома, каб яна добра нагрэла чысценькага жоўтага пясочку, насыпала ў сваю панчоху ды прылажыла такі "прапар" да хворай нагі мужа. У зямлі ёсць многа цалебнай сілы, і той, хто ад зямлі адрываецца, не ступае па ёй босымі нагамі, не качаецца ў цёплы летні дзень у жоўценькім пясочку, лёгка падпадае розным за-*



**Яніна і Аляксей Кулакоўскія з сынамі Лёнем і Жэнем.**
Надпіс на адваротным баку:
**«Галине от меня и моей семьи. Нина. 29.VI.52. Минск».**

*хворванням. <…> Я хадзіў з жонкай па ваколіцах Ждановіч. Тады там было шмат маладых хвайнікоў, дзе раслі баравікі, і пападаліся часта пясчаныя мясціны. Раптам у Марыі Дзмітраўны так забалела нага, што яна не магла ступіць на яе. Я пасадзіў М. Д. на гарачы жоўты пясок і кажу: пасыпай нагу гарачым пяском, нагрэтым сонцам. Пазаймалася яна гэтай працадурай мінут з дзесяць. Боль спыніўся, мая добрая дружачка ўстала – боль як рукою зняло, і мы пашлі снаваць па хвайняках, па тых мясцінах, якія прыходзіліся нам па душы*» [2, с. 102].

На пачатку лістапада жыццёвыя клопаты ў сям'і Кулакоўскіх, здаецца, адступаюць, прынамсі Аляксей Мікалаевіч зноў устае на ногі і можа хадзіць на працу. А Яніна Ульянаўна вырашае ўжо сама запрасіць да сябе ў госці Якуба Коласа: "*Вельмі хацелася запрасіць Вас да нас у госці, але не адважваліся турбаваць*" [1, адз. зах. 68]. Паэт з ахвотай згаджаецца: "*За Ваша жаданне пабачыцца ў Вольны дзень у Вас на кватэры таксама прыношу Вам вялікую падзяку. Я з ахвотаю пабуду ў Вашай хаце, у коле Вашай сям'і*" [2, с. 105]. Сустрэчу прызначылі на нядзелю 27 лістапада [1, адз. зах. 46]. Цяжка адназначна сказаць, зыходзячы з наяўных матэрыялаў, ці адбылося ўрэшце даўно планаванае спатканне. Апошні ліст Яніны Кулакоўскай датуецца 23 лістапада. Некаторыя ж вытрымкі з ліста Якуба Коласа ад 21 снежня схіляюць да думкі, што пабачыцца ў гасцях з сям'ёй Кулакоўскіх яму так і не давялося: «*Не ведаю, ці ўспаміналі Вы мяне, я-ж часта ўспамінаю Вас такою, якою былі Вы на другім паверсе пісьменніцкага дома ў Каралішчавічах. Сур'ёзная, строгая, заклапочаная думкамі аб сваіх "багатырах", а можа быць і яшчэ нейкімі мыслямі*» [2, с. 106]. Як бачым, паэт зусім не згадвае сустрэчу, якая мусіла адбыцца меней чым месяц таму, распавядае адно пра леташнія ўражанні з Каралішчавічаў.

Такім чынам, з перапіскі відаць, што паміж Якубам Коласа і Янінай Кулакоўскай і яе блізкімі ўсталяваліся даволі прыязныя стасункі, якія, аднак, у перыяд ад жніўня 1955 г. да студзеня 1956 г. не выходзілі за межы ліставання. Што і не дзіўна: паэт у тыя месяцы мусіў шмат займацца грамадскай работай, выступаў з публіцыстычнымі артыкуламі, працаваў над новымі вершамі, апавяданнямі. Пра стан жа свайго здароўя ў апошнім лісце з перапіскі Якуб Колас пісаў:

"*Прыкрая рэч – хвароба. Лягжыш адзін, і мала хто прыходзіць адведаць. Асабліва цяжка зімоваю парою: дні кароткія, ночы доўгія, а сплю кепска. А горш за ўсё, што і па ачунянні прыходзіцца вельмі асцерагацца, каб не застудзіцца. Лёгкія знасіліся. Цяперашняе захворванне ўжо 25-ае, пачынаючы з 1946 г.*

*Не цікавае пісьмо пішу Вам, Ніна Ульянаўна. Як Вы жывеце? Як Аляксей і дзеці?*

*Не забывайце.*

*Усяго найлепшага.*

*Якуб Колас*" [2, с. 107].

**Спіс літаратуры**

1. **Прыватны архіў нашчадкаў Якуба Коласа.** – Воп. 54.

2. **Колас, Я.** "Пакі жыць буду, буду ўспамінаць вас" / Я. Колас // Полымя. – 2000. – № 11. – С. 97 – 107.

**Іван ДУБОВІК,**
старшы навуковы супрацоўнік
Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага
музея Якуба Коласа.